# Зачараваныя небам


Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Потым служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Тут, у Бабруйску, ажаніўся, двойчы стаў бацькам. Потым была Германія, а тады зноў Беларусь. У запас палкоўнік авіяцыі пайшоў ужо з пасады начальніка армейскай і транспартнай авіяцыі краіны. Сёння Аляксандр Паўлаў тэсціруе авіятрэнажоры, створаныя айчынным ВПК, — адным словам, той жа лётчык-выпрабавальнік.

— Раней трэнажораў не было, авіятары асвойвалі тэхніку непасрэдна падчас палётаў, — расказвае верталётчык. — А як падчас рэальнага палёту можна адпрацаваць асаблівыя выпадкі: напрыклад, адмова рухавіка або пажар на борце? Дзякуючы сучасным трэнажорам гэта магчыма. Цяперашняе пакаленне лётчыкаў і верталётчыкаў да аўтаматызму адпрацоўвае ўсе асаблівыя выпадкі, каб у рэальнай сітуацыі (вядома, лепш каб не было!) справіцца з усімі цяжкасцямі.

## ЛЮБОЎ ДА АВІЯЦЫІ — У СПАДЧЫНУ

Тое, што сын пайшоў па бацькавым шляху, не дзіўна. Яўген Паўлаў з маленства хадзіў з бацькам на аэрадром, назіраў за тым, як ён лятае, — любоў да авіяцыі, без перабольшання, перадалася яму ў спадчыну. Паўплывала і асяроддзе, у якім рос: у ваенных гарадках, дзе жылі, лётчыкі і верталётчыкі былі на кожным кроку. Яшчэ школьнікам лятаў на верталётах. Вядома, у якасці пасажыра.

Як прызнаецца Яўген, падчас выбару прафесіі бацька ніколі не навязваў яму сваё меркаванне. «Спачатку я хацеў стаць кардыяхірургам, але да авіяцыі ў мяне любоў з дзяцінства, — расказвае верталётчык. — Я заўжды ганарыўся, што мой бацька — лётчык. Сёння падобныя словы чую ўжо ў свой адрас ад дачкі...»

Бацькавай радасці не было мяжы, калі сын паступіў на авіяцыйны факультэт Ваеннай акадэміі. А адзін раз, ужо праз некалькі гадоў пасля вучобы, старэйшаму Паўлаву нават удалося асабіста ацаніць узровень сынавай падрыхтоўкі.

**«Неба ўсюды адно і тое ж, — перакананы Яўген Паўлаў. — Калі падымаешся ўвысь, застаешся сам-насам са стыхіяй».**

— Я паляцеў з ім у якасці інструктара, — прыгадвае Аляксандр Паўлаў. — І быў задаволены палётам, а галоўнае, пераканаўся ў тым, што мой сын на сваім месцы. Ён вельмі любіць лятаць...

Здаецца, яму пашанцавала больш, чым бацьку. Яўген як прыйшоў у 50-ю змешаную авіябазу пасля Ваеннай акадэміі, так служыць тут ужо дванаццаты год. Але, як прызнаецца сам верталётчык, ён гатовы да ўсяго, бо да пераездаў прызвычаіўся з дзяцінства.

— Неба ўсюды адно і тое ж, — перакананы Яўген Паўлаў. — Калі падымаешся ўвысь, застаешся сам-насам са стыхіяй. Ёсць толькі ты і пяты акіян. Бывае, ляціш ноччу па маршруце, глядзіш, а сярод лесу адна хатка свеціцца. Думаеш, а хто там жыве, а які ў таго чалавека лёс. Вось тут людзі разам жывуць, а ён тут адзін... Калі ў мяне пэўныя сямейныя праблемы (напрыклад, захварэе дзіця) або непрыемнасці на службе, варта толькі ўзляцець і ты пра ўсё забываеш. Думаеш толькі пра палёт і пра выкананне пастаўленай задачы.

Да нядаўняга часу Яўген Паўлаў лятаў на верталёце Мі-8 старой мадыфікацыі. Цяпер ён сярод тых шчаслівчыкаў, хто сядзіць за штурвалам новых вінтакрылых машын, якія нядаўна папоўнілі авіяпарк 50-й базы. Як прызнаецца лётчык, перавучыцца было нескладана. «Па тэхніцы пілатавання дадзеная мадыфікацыя мала чым адрозніваецца ад папярэдняй, — лічыць камандзір верталётнага атрада (на Мі-8) верталётнай эскадрыллі (на Мі-24, Мі-8). — Але гэта ўжо ўдасканаленая тэхніка, машына ХХІ стагоддзя».

Як кажуць верталётчыкі, сапраўдны прафесіянал павінен лятаць у любое надвор'е. Цікава, што і бацька, і сын аддаюць перавагу пахмурнаму небу.

— Чым складаней, тым лепш. Лятаць у сонечнае надвор'е — лягчэй лёгкага, а вось у неспрыяльнае... — кажуць яны ў адзін голас.

— Ці часта звяртаецеся да бацькі па прафесійныя парады? — пытаюся ў Яўгена.

— Пастаянна. У яго багацейшы вопыт службы ў савецкай арміі. Мы многае ўзялі менавіта адтуль. Менавіта на той базе, на той старой школе мы пабудавалі нашы беларускія ваенна-паветраныя сілы. Наша авіяцыя займае дастойнае месца ва Узброеных Сілах, а некаторым дзяржавам нават ёсць чаму ў нас павучыцца!

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# МОРА Ў АГНІ

**У той час як 67-ы Берлінскі кінафестываль, што завяршыўся 18 лютага, толькі-толькі падвёў вынікі і назваў пераможцам венгерскую карціну «Пра цела і душу» Ільдзіка Эньедзі, у абмежаваны мінскі пракат выходзіць уладальнік «Залатога мядзведзя» мінулага Берлінале.**



Для дакументальнай карціны «Мора ў агні» Джанфранка Розі вылучана толькі тры паказы, якія адбудуцца 24, 26 і 27 лютага ў кінатэатры «Цэнтральны». Яна расказвае пра дні італьянскага вострава Лампедуза, праз які праходзяць тысячы мігрантаў у пошуках акна ў Еўропу.

...Рэжысёр прыехаў на Лампедузу, каб зняць дзесяціхвілінную кароткаметражку пра жыхароў вострава. Урач, да якога той звярнуўся з бранхітам, расказаў шмат цікавых рэчаў пра сваю практыку з мігрантамі — яны тысячамі, калі жывыя, то знясіленыя, прыбываюць на Лампедузу як на перавалачны пункт, каб далей адправіцца шукаць лепшага жыцця ў Еўропе. У выніку Джанфранка Розі застаўся тут на паўтара года і стварыў поўнаметражную карціну пра трагедыю сучаснасці. Фільм аказаўся не проста кан'юнктурным — бо тэма мігрантаў апошнім часам прыносіць творцам шмат перамог, — а адной з найважнейшых кінакарцін года, якую нельга прапускаць.

Эксклюзіўныя паказы пераможцы Берлінале пройдуць у рамках праекта «Лістапад. Калекцыя».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**23 ЛЮТАГА**

**1808** год — дата нараджэння Пятра Васілевіча Кірэеўскага, рускага фалькларыста, археографа. У 1830-я гады наведаў Беларусь, ад мясцовых збіральнікаў атрымаў больш за 800 тэкстаў беларускіх народных песень і прыпевак, у асноўным з Мінскай губерні. Беларускія матэрыялы (песні калядныя, валачобныя, купальскія, жніўныя, вясельныя, прыпеўкі да танцаў з ваколіц Слуцка, Мінска, Барысава, Івянца, Талачына і інш.) склалі «Беларускі архіў» Кірэеўскага. Памёр у 1856 годзе.

**1826** год — Мікалай Іванавіч Лабачэўскі выступіў на пасяджэнні фізіка-матэматычнага факультэта Казанскага ўніверсітэта. Ён прадставіў даклад «Сціслы выклад пачаткаў геаметрыі са строгім доказам тэарэмы аб паралельных». Гэтым самым быў пакладзены пачатак неэўклідавай геаметрыі.

**1878** год — нарадзіўся Казімір Северынавіч Малевіч, беларускі і расійскі жывапісец-абстракцыяніст. Адзін з заснавальнікаў абстрактнага мастацтва, заснавальнік супрэматызму. У 1904—1905 гг. — вольны слухач Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства. У 1918-м выкладаў у Дзяржаўных вольных мастацкіх майстэрнях у Маскве і Петраградзе, у 1919—1922 гг. — у Народнай мастацкай школе «новага рэвалюцыйнага ўзору» ў Віцебску. Затым — дырэктар Ленінградскага інстытута мастацкай культуры. Аўтар славутага «Чорнага квадрата». Сярод карцін: «Жанчына з кветкай», «Квітнеюць яблыні» і іншыя. Заснавальнік арганізацыі «Сцвярджальнікі новага мастацтва» («Уновіс»). У 1920 годзе кіраваў мастацкім афармленнем свята 3-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Віцебску. Памёр у 1935 годзе.



**1947** год — нарадзіўся Валерый Аляксандравіч Кучынскі, спявак, заслужаны артыст Беларусі. З 1967 года — саліст Ансамбля песні і танца БВА, у 1970—1973 і 1976—1979-х гадах — Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Сярод оперных партый: Максім («Зорка Венера» Ю. Семяняκі), Анегін, Ялецкі («Яўген Анегін», «Пікавая дама» П. Чайкоўскага) і многія іншыя. У канцэртным рэпертуары — камерная лірыка, песні беларускіх кампазітараў. Лаўрэат усесаюзных і міжнародных конкурсаў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Памёр у 2016 годзе.

Было сказана

**Уладзімір КАРЫЗНА, паэт:**

*«Якое ўсё ўмоўнае —*
*І радасць,*
*І журботлівы настрой...»*


Уважаемые акционеры

**ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции»!**

**30 марта 2017 года в 14.00**

состоится годовое общее собрание акционеров.

Место проведения собрания: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, административное здание Общества, 2-й этаж, актовый зал.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2016 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2016 году, рассмотрение результатов ежегодной ревизии – по результатам финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.

Рассмотрение аудиторского заключения по итогам проведения ежегодного аудита Общества за 2016 год.

4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках и распределение прибыли и убытков Общества за 2016 год.
5. План распределения чистой прибыли Общества на 2017 год.
6. О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, на 5-м этаже, в кабинете службы менеджмента качества с 10 по 29 марта 2017 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00), а в день проведения собрания – по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания – с 13.00 до 13.50.

При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров будет сформирован по состоянию на 01.03.2017 года.

УНП 600122771 Наблюдательный совет



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ

**27 марта 2017 года торгов по продаже имущества,**
на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, местонахождение, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Балансодержатель (должник) | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| Здание склада (склад заготовок блоко-цехов главного корпуса), инвентарный номер №500/С-31835, общей площадью 13137,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Красноармейская, д. 21 | ИООО «Белбизнесальянс» | 9 153 748,00 | 300 000,00 |

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 27 марта 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 24.02.2017 по 23.03.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»).



УНП 490912965

## О Т Ч Е Т

Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития

**«Эко-Инновация»**

об использовании своего имущества за 2016 год

Количество учредителей Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» – 4, из них 3 – физические лица.

Информация о стоимости имущества Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» (далее – Фонд):

– стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 2045 белорусских рулей 00 копеек в деноминированных единицах;

– поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с уставом Фонда (целевое финансирование), составляют 37 057 белорусских рублей 96 копеек;

– поступления из иных источников, не запрещенных законодательством, – 2852 белорусских рублей 45 копеек.

Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе Фонда, составила 29 062 белорусских рублей 88 копеек.

Фонд не имеет филиалов.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

Директор Е. Ф. Молочко, бухгалтер Е. Я. Ходот.